ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
5 САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 8(1529)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Са святам 8 Сакавіка!

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### На пашыраным

пасяджэнні партыйнага камітэта абмеркаваны ход перабудовы работы пярвічных партыйных арганізацый у святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС і IV пленума ЦК КП Беларусі. З дакладам выступіў сакратар парткома прафесар М. І. Юрчук.

Партыйны камітэт адзначыў, што партыйныя арганізацыі БДУ праводзяць пэўную работу па перабудове вучэбнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай работы. На механіка-матэматычным, філалагічным і гістарычным факультэтах вядзецца пошук новых форм развіцця і кантролю самастойнай работы студэнтаў. Актыўна ўкараняюцца ў жыццё формы студэнцкага самакіравання як у сферы быту і адпачынку студэнтаў, так і ў вучэбным працэсе.

Разам з тым істотнай перабудовы ў дзейнасці партыйных арганізацый факультэтаў і падраздзяленняў не назіраецца. На большасці факультэтаў усё яшчэ няма дакладнага ўяўлення аб парадку ўліку нагрузкі выкладчыкаў і кантролю за самастойнай работай студэнтаў, не вырашаны метадычныя пытанні перабудовы вучэбнага працэсу.

Партыйныя арганізацыі і кіраўнікі навукова-даследчай часткі, НДІ і факультэтаў недастаткова надаюць увагі павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў.

Сур'ёзнага паляпшэння патрабуе маральна-псіхалагічны клімат на геаграфічным факультэце, факультэце журналістыкі, кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў, кафедры гісторыі філасофіі і логікі і ў некаторых іншых падраздзяленнях.

Марудна ўдасканальваюцца ўнутрыпартыйныя справы, недастатковая баявітасць партарганізацый, адсутнічае дакладная сістэма кантролю і праверкі выканання, не выконвае належнай ролі крытыка і самакрытыка, патрабуе паляпшэння работа з крытычнымі заўвагамі і прапановамі камуністаў. Неабходна ўдасканальваць работу з кадрамі, палепшыць ідэйна-выхаваўчую работу. Не адбылося перабудовы ў арганізацыі нагляднай агітацыі і насценнага друку, марудна ўдасканальваецца сістэма партыйнай адукацыі.

Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова. У дапаўненне да «Арганізацыйна-палітычных мерапрыемстваў парткома і рэктарата універсітэта па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС» зацверджаны «Мерапрыемствы партыйнага камітэта БДУ імя У. І. Леніна па перабудове палітыка-выхаваўчай, вучэбнай і навукова-даследчай работы ў святле рашэнняў IV пленума ЦК КП Беларусі».

У. САТОЛІН,
інструктар парткома.



асабістае

## Прывітанне, Марына!

**(адкрытае пісьмо дэлегату XXVIII з'езда ЛКСМБ)**

Я ВЕДАЮ, што ты сёння з самай раніцы хвалявалася: у 10 гадзін пачаў работу з'езд камсамола рэспублікі. Ці памятаеш сваё здзіўленне, калі справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя Мінскай вобласці назвала цябе, Марыну Міхайлаву, студэнтку III курса хімічнага факультэта БДУ дэлегатам XXVIII з'езда ЛКСМБ? Ты сама казала, што першай была думка: «Пэўна ж ёсць ва універсітэце людзі больш вядомыя сваімі справамі, чым я. Чаму ж выбралі іменна мяне?»

Так, у шматтысячнай камсамольскай сям'і Белдзяржуніверсітэта ёсць імянныя стыпендыяты, і чэмпіёны ў спорце, і будучыя вучоныя, якія ўжо гавораць свае першыя словы ў навуцы. Ты ж не маеш медалёў за працу ў III працоўным семестры. Ты не змагалася ў Афганістане, як нашы многія юнакі. Ты проста вучылася, актыўна ўдзельнічала ў грамадскай рабоце. Ты — такая, як многія з тых, хто сядзіць у аўдыторыях, «калдуе» ў лабараторыях. І якраз таму, што ты самая звычайная студэнтка, цябе і выбралі дэлегатам з'езда. А яшчэ, зразумела, таму, што для камсамола ты аддаеш свае сілы, веды, здольнасці, не лічачыся з асабістым часам і настроем.

Ведаеш, я зайздрошчу твайму энтузіязму, гарэнню твайму. Ты з тых, хто верыць у камсамол, хто шчыра заклапочаны тым, каб ВЛКСМ стаў сапраўды авангардам нашай моладзі. Пэўна, нехта глядзіць табе ўслед і думае: во дзівачка! Так, ты дзівачка! Дзівацтва тваё — гэта вера ў людзей, твая шчырасць, тваё шчасце.

Настаўніца Любоў Сямёнаўна Алукер можа ганарыцца сваёй выхаванкай, бо хімія стала для цябе не толькі захапленнем, але і сапраўднай працай. Гэта не проста словы. Калі рабіць тое, што падабаецца, то зусім не адчуваеш цяжкасці і складанасці работы. Гэта, Марына, твае словы. А вучоба табе падабаецца.

А як жа ўсё астатняе: староста, член камітэта камсамола універсітэта, кнігі і проста жаданне пагутарыць з сяброўкай? Як жа ты паспяваеш? Задаю пытанне і ўжо чую адказ: «Гэта ж зусім проста, трэба толькі быць вельмі сканцэнтраванай, не губляць дарэмна час». Мала так думаць, трэба яшчэ і жадаць гэтак жа рабіць. У цябе жаданне ёсць, больш таго, ёсць патрэба ўсюды паспець.

Часам бывае і табе самотна, калі бачыш абыякавасць, безініцыятыўнасць. Не сумуй, Марына. Успомні, як прайшоў у групе апошні камсамольскі сход, калі абмяркоўвалі Статут камсамола. Як ніколі — дзве гадзіны спрэчак. Значыць, не зусім зачарсцвелі мы. І твае намаганні расшавяліць камсамольскі актыў не прападуць дарэмна, бо ты не адна. Ведаю, што ты не лічыла б сябе багатай і шчаслівай без тых сустрэч і клопатаў, якія паўсюдна з табой зараз. І я шчыра хачу, каб гэтае багацце было ў цябе заўсёды!

С. ГОГАЛЬ.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# Дарога ў ВНУ

МІНІСТЭРСТВА вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР зацвердзіла правілы прыёму ў ВНУ на 1987 год. Аб тым, якія ўнесены ў іх змяненні, паведаміў на прэс-канферэнцыі, прайшоўшай 20 лютага, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Г. А. Ягадзін. Новыя правілы, падкрэсліў міністр, вынікаюць з асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай адукацыі ў краіне, немачаных ЦК КПСС. Яны нацэлены на адбор перадавой, найбольш падрыхтаванай да навучання ў ВНУ моладзі.

У гэтым годзе адменена прадастаўленне дадатковых балаў па выніках прафарыентацыйнай гутаркі. Эксперымент паказаў, што яна не заўсёды рабіла абгрунтаваны ўплыў на вынікі конкурснага адбору. Прыёмным камісіям дадзена права праводзіць усе экзамены ў пісьмовай форме. Гэта павысіць дакладнасць пастаўленай выкладчыкам ацэнкі, выключыць суб'ектывізм у праверцы ведаў.

Абітурыенты будуць здаваць тры экзамены: па рускай (роднай) мове і літаратуры ў форме сачынення і два экзамены па профілю навучальнай установы. Конкурс па выніках экзаменаў на дзённае аддзяленне сярод абітурыентаў, маючых стаж работы звыш двух гадоў і прыраўнаваных да іх асоб, і сярод не маючых яго праводзіцца раздзельна.

Прадастаўлены перавагі медалістам школ і выдатнікам сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, а таксама абітурыентам, у якіх профіль папярэдняй адукацыі або працоўнай дзейнасці адпавядае выбранай у ВНУ спецыяльнасці.

Для паступаючых у медыцынскія, педагагічныя, сельскагаспадарчыя і некаторыя іншыя ВНУ ўведзены дадатковыя патрабаванні, якія адлюстроўваюць спецыфіку падрыхтоўкі спецыялістаў данага профілю. Так, на педагагічныя спецыяльнасці будуць прымацца асобы, якія маюць схільнасць або вопыт работы з дзецьмі, а таксама рэкамендацыі педагагічных саветаў школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафтэхвучылішчаў, органаў народнай асветы, працоўных калектываў, гарадскіх і раённых камітэтаў камсамола.

У медыцынскіх ВНУ пачынаецца пераход на камплектаванне студэнтаў з юнакоў і дзяўчат, якія працавалі ў якасці малодшага або сярэдняга медыцынскага персаналу не менш двух гадоў, а таксама з ліку звольненых у запас ваеннаслужачых.

Будзе працягвацца эксперымент у ВНУ Масквы, Маскоўскай вобласці і Ленінграда, які прадугледжвае правядзенне прыёму студэнтаў у ліпені. У ВНУ іншых гарадоў прыём уступных экзаменаў будзе праходзіць у жніўні.

(Кар. ТАСС).

*з пошты*

# Так трымаць!

**ВЯЛІКУЮ І СУР'ЁЗНУЮ СПРАВУ ПА УМАЦАВАННЮ СУВЯЗЕЙ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ З ПРАЦОЎНЫМІ КАЛЕКТЫВАМІ ГОРАДА, З ВЕТЭРАНАМІ ВАЙНЫ І ПРАЦЫ ПРАВОДЗІЦЬ КАМІТЭТ КАМСАМОЛА ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ імя У. І. ЛЕНІНА НА ЧАЛЕ З ЛАРЫСАЙ СЕРГУН.**

НЯДАЎНА група студэнтаў гэтага факультэта пабывала ў калектыве жыхароў і супрацоўнікаў ДУ-5 Беларускай чыгункі на святочным сходзе, прысвечаным Дню Савецкай Арміі. Яны прыйшлі сюды, каб з дапамогай мастацкага слова, музыкі і песні павіншаваць ветэранаў вайны і арміі і тым самым прынесці людзям крышку радасці, аддаць ім даніну павагі і шанавання. І трэба было бачыць, колькі ўдзячнасці свяцілася на тварах удзельнікаў сходу, большасць з якіх — камуністы, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Студэнты ўнеслі ў сход жывы струмень свайго юнацкага задору, непасрэднасці, гарачага імкнення зрабіць для жыхароў Мінска нешта карыснае.

Прысутныя з захапленнем слухалі вершы беларускіх і рускіх паэтаў, народныя, аўтарскія песні і песні савецкіх кампазітараў у выкананні Аляксандра Нільсана, Святланы Кончык, Людмілы Мельнікавай, Ірыны Дзялендзік, студэнтак-грузінак Мехузла Кеціно і Абуладзе Іветы. На канцэрце гучала мова руская, беларуская, грузінская; сучасныя песні чаргаваліся з песнямі мінулых год, асабліва шырока былі прадстаўлены песні на тэму вайны і міру. Святочны сход ператварыўся ў сапраўдны фестываль дружбы народаў і пакаленняў. З першага нумара канцэрта паміж артыстамі і гледачамі ўсталяваўся цесны кантакт, многія песні спявалі сумесна. Гаспадары доўга не хацелі адпускаць гасцей з залы, прасілі прыязджаць часцей.

Можна толькі вітаць такую жывую сувязь студэнцкай моладзі з народам, з жыццём. Было б надзвычай добра, каб такая традыцыя трывала і надоўга замацавалася за студэнцкімі калектывамі. І не толькі за філфакаўцамі.

Ад імя калектыву ДУ-5
А. ТАРНОЎСКАЯ,
педагог-арганізатар клуба «Равеснік».

*камсамольцы ПА*



*Аб чым задумалася Вольга Багарановіч? Уявіла сябе настаўніцай гісторыі, а можа, успомніла свае дзіцячыя мары? Першы крок да іх здзяйснення ўжо зроблены — яна слухачка падрыхтоўчага аддзялення гістарычнага факультэта, сакратар бюро ВЛКСМ падрыхтоўчага аддзялення.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

*праццу слова*

# «Падумаем разам»

ТАВАРЫШ СТУДЭНТ! У апошнім нумары нашай газеты быў апублікаваны праект прыкладнага палажэння аб студэнцкім самакіраванні. Гэту тэму ты, зразумела, не адзін раз ужо абмяркоўваў у гутарках з таварышамі. На маю думку, няма ва універсітэце чалавека, які б застаўся ў баку — гэтае пытанне закранае кожнага з нас. Свае праблемы — рашаць іх самім — такі асноўны стрыжань палажэння.

Праект палажэння аб студэнцкім самакіраванні прадугледжвае значнае пашырэнне правоў і абавязкаў студэнцкіх калектываў. Гэта адпавядае курсу партыі на паслядоўнае развіццё сацыялістычнага самакіравання народа.

Гарантыяй дзейснасці самакіравання павінен стаць актыўны ўдзел у яго абмеркаванні ўсіх студэнтаў. Абыякавых быць не павінна!

Праект прыкладнага палажэння прапаноўваецца ўсебакова абмеркаваць на сходах груп, курсаў, факультэтаў.

Свае прапановы, заўвагі, якія датычаць ролі і правоў студэнцкіх калектываў, можна прадставіць у камітэты камсамола факультэта, універсітэта, рэдакцыю «Беларускага універсітэта».

А. РУСАКОВІЧ,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце.

# Прайшло святкаванне

*25-ГОДДЗЯ з дня стварэння падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян.*

*Замежныя студэнты наведалі прамысловыя прадпрыемствы: трактарны завод, завод аўтаматычных ліній, маторны завод.*

*Закончыліся юбілейныя мерапрыемствы інтэрнацыянальным вечарам-сустрэчай навучэнцаў падрыхтоўчага факультэта з моладдзю Мінскага вытворчага тонкасуконнага аб'яднання імя Т. Я. Кісялёва і ўрачыстым сходам выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта.*

*З дакладам пра 25-гадовы шлях факультэта выступіў яго дэкан дацэнт У. М. Стрэльчанка. Ён адзначыў, што за гады свайго існавання факультэт выпусціў больш як 4500 замежных грамадзян, якія потым паспяхова прадоўжылі навучанне ў ВНУ краіны, набываючы неабходную спецыяльнасць для работы на сваей радзіме.*

*Прысутных павіншавалі шчырымі словамі намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч, рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі. Яны адзначылі вялікі ўклад выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта ў падрыхтоўку нацыянальных кадраў сацыялістычных краін і краін, якія развіваюцца, уручылі ўзнагароды.*

*Сход закончыўся прывітаннем студэнтаў-замежнікаў і канцэртам, падрыхтаваным супрацоўнікамі факультэта.*

*І. ЧЭПА,*
*намеснік дэкана падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян.*



*працягваем размову*

# А ГАЛОЎНАЕ ЗАСТАЛОСЯ ЗА «КАДРАМ»

Я ўважліва прачытала абедзве публікацыі Н. Стралковай (глядзі матэрыялы «Выпадковасць? Заканамернасць» за 12 лютага і «Перад дабром здыміце капялюш» за 26 лютага) пра Ігара (прозвішча не ўказваецца) і вырашыла выправіць «памылку» аўтара — праінфармаваць чытачоў, як практычна чырвонадыпломнік увасабляе сёння свае веды ў канкрэтныя справы. Але спачатку...

Сваю другую, ужо пераддыпломную практыку Ігар праходзіў у нашай газеце. Востры розум, ініцыятыўнасць, камунікабельнасць — усё гэта спачатку было завуаліравана, на першы план выступалі руплівасць і стараннасць. Спатрэбілася ўсяго некалькі добрых гутарак — і чалавек змяніўся, у яго прачнуліся прага творчасці, жаданне пасапраўднаму праверыць сябе. І мы ў сваім невялікім калектыве пастараліся падтрымаць яго, стварыць спрыяльныя ўмовы для самасцвярджэння і самавыказвання.

А яшчэ праз нейкі час у нас адбыўся з ім такі дыялог:

— Ігар, ты зможаш, калі мы цябе прама зараз афармім на працу, адначасова пісаць дыплом і выдаваць па 600 радкоў у нумар?

— Гэта цяжка. Я ж прэтэндую на «чырвоны»...

— А ўсё ж? Павер, ты нам падыходзіш і вельмі патрэбны.

— Вы мяркуеце, я здолею?

— Калі сапраўдны журналіст — так, а калі толькі будучы аспірант — не. Вырашай сам.

З таго дня прайшоў амаль год. У мінулым засталіся дні і ночы знясільваючай працы мозгу, безліч думак наконт размеркавання... Ён усе вытрымаў. Усё змог. І цяпер па праву лічыцца лепшым пяром рэдакцыі, самым надзвычайным дзіваком з усіх дзівакоў.

Пра тое, наколькі актуальныя і дзейсныя прапанаваныя ім матэрыялы, гаворыць і такая лічба — каля 20 рэагаванняў кіраўнікоў розных рангаў за год. Вось і мяркуйце самі: ці пайшлі яму на карысць «сядзенні» ў «чыталцы», ці пераплавіўся граніт навукі ў канкрэтныя справы?

«Поўная самарэалізацыя» — так скарочана можна сфармуляваць яго дэвіз, якога ён нястомна прытрымліваецца. Цяпер — 800 радкоў у нумар і штодзённая падрыхтоўка да паступлення ў аспірантуру. Прынамсі, без ніякіх спасылак на стомленасць і саладжавых «увайдзіце ў маё становішча». Не было выпадку, каб ён не змог, не паспеў ці проста схалтурыў. З надзвычайнай працаздольнасцю ён выдае сотні і сотні радкоў, затрачваючы пры гэтым роўна столькі ж жывых клетак душы.

Вось такі ён, наш Ігар. І не трэба чакаць 20 гадоў, каб адназначна сказаць: з яго атрымаецца думаючы і вельмі чалавечны вучоны, таму што сёння, перш чым «выліцца» на газетную паласу, ён звязваецца з многімі людзьмі і дасканала правярае кожны факт, кожны радок з адной мэтай — які гэта дасць эфект у будучым, ці дапаможа паляпшэнню справы, ці не выб'е ў каго-небудзь незаслужана глебу з-пад ног.

Рэдактар шматтыражнай газеты, у якой працуе герой дзвюх папярэдніх публікацый Н. Стралковай.

